## ЭХ, КАБ ЗНАЛІ МЫ ЛЯСНУЮ МОВУ,
## КОЛЬКІ КАЗАК МЫ ПАЧУЛІ Б НОВЫХ!

*(Іван Муравейка)*



— Васілінка, колькі таямніц хавае лес! Так хочацца пра іх даведацца! Але я так рэдка бываю ў лесе, — засмучана вымавіў Лянок.

— У лес мы абавязкова сходзім са сваімі бацькамі. Але шмат лясных таямніц нам можа паведаць кніга. Давай пачытаем...



Якія казкі пра лясных звяроў вы чыталі? Паслухайце казку і скажыце, якія лясныя жыхары дапамагалі Алесіку.



Правообладатель Национальный институт образования

# Сказ пра тое, як Алесік заблука́ў аднойчы ў лесе

*Генадзь Аўласенка*

Не́як раз малы́ Алесік за грыбамі ў лес пайшоў. Ён ішоў, ішоў па лесе, са сцяжынкі прэч сышоў. Як сышоў — так і пайшоў, зноў сцяжынкі не знайшоў.

Вось якая незада́ча! Ну куды ісці, куды? Пад ялі́най стаў і плача — хто ж пазба́віць ад бяды?

Заяц з лесу выбяга́е, да Алеся падбягае.

— Не бяду́й, — крычыць, — Алесік! Ты пабудзь са мной у лесе! Будзем разам мы гуляць: і скакаць, і танцаваць!

І, узяўшы лапы ў бокі, Заяц так пайшоў у скокі, што Алесік не стрыма́ўся, замест пла́чу — рассмяяўся. Ну а потым усміхну́ўся, вакол сябе азірну́ўся, уздыхнуў і кажа:

— Не! Не магу, прабач мне! Як жа мне з табой застацца — мама будзе хваля́вацца! Ты мне ле́пей дагадзі́ — да сцяжынкі давядзі!

Зай Алесіка паслухаў і паты́ліцу пачу́хаў. Потым кажа:

Правообладатель Национальный институт образования

— Эх, Алесік! Шмат сцяжынак тут, у лесе! І якая з іх твая — хіба па́мятаю я! Ты б на дрэва лепш узлез — з дрэва лепей ба́чны лес...

Глядзь Алесік на асінку — надта ж тонкія галінкі! Дый калючыя яны... Лепш пада́цца да сасны! Падбягае... а сасна — вельмі ж гладкая яна! І высокая, да неба...

Ды кудысьці ж лезці трэба!

Тут Ваверка на ялінцы — скок па тоненькай галінцы. Кажа:

— Я дапамагу! Як змагу і чым змагу! У бядзе я вас не кіну, забяруся на яліну, пагляджу́ ва ўсе бакі́. Вы ж чакайце, дружбакі́!




Правообладатель Национальный институт образования

І, закончыўшы гаворку, паскака́ла ўверх Вавёрка. Ско́к з галінкі на галінку — вось ужо і верхаві́нка. А з яе ўсе бачны сцежкі, і вядуць яны на ўзме́жкі. І Алесева сцяжынка добра ба́чна з верхавінкі.

Шлях Вавёрка адшукала, хлапчука не ашука́ла. Паказала накіру́нак — атрымала падарунак — велічэзны баравік, а з ім разам махавік і чатыры сыраежкі. А Алесь пайшоў да сцежкі.

Заяц побач з ім скакаў, кошык несці памагаў. Па дуброве, пералеску, дабрылі́ яны да ўзлеска. Тут, на ўзлеску, Зай застаўся і з Алесем развітаўся. І сказаў:



— Бывай, Алесік! Ты да нас прыходзь ізноў. Вельмі добра, што і ў лесе ты знайшоў сабе сяброў!

Зай пабег назад, вядома, а Алесь пайшоў дадому. Ну а дома па

Правообладатель Национальный институт образования

сакрэце расказаў мне казку гэту. Я ж паслухаў, запісаў, вам нічога не казаў. А калі вы што прызналі — значыць, самі прачыталі!

1. Як Алесік апынуўся ў лесе? Што з ім здарылася?
2. Што прапанаваў Алесіку Зайчык? Прачытайце.
3. Чаму Алесік не згадзіўся на прапанову Зайчыка?
4. Якія радкі казкі гавораць пра тое, што хлопчык вельмі любіць сваю маму?
5. Хто з герояў твора вам спадабаўся? Чаму? Каго з іх вы лічыце ветлівымі? Чаму? Знайдзіце ў казцы словы і выразы ветлівай размовы.
6. Размяркуйце ролі і выразна прачытайце казку па ролях.

Прачытайце і адгадайце загадку.

Да вясны жыхар лясны
Не вылазіць з-пад пярыны,
Усю зімку бачыць сны
Пра салодкія маліны.

*Павел Сушко.*





Правообладатель Национальный институт образования

**Уту́льна** — *рус.*: уютно.

Разгледзьце малюнкі. Як мядзведзь уладкаваўся на зіму? Прачытайце верш.

## Мядзведзь

*Янка Журба*

Прыйшла з вятрамі восень,
шуміць высокі лес.
Пайшоў мядзведзь па лесе,
далёка ў глуш залез.
Пад елкай вырыў яму,
паслаў у ёй галлё —
і ўжо гатова ў мішкі
зімовае жыллё.



Правообладатель Национальный институт образования

А каб мароз траскучы
не ўлез к яму зімой,
наклаў галля над новай
бярлогаю сваёй.
Вось мішка ўжо ў бярлозе,
уту́льна тут яму.
Паправіў ён галінкі,
залёг на ўсю зіму.
Прыйшла зіма з марозам,
заснуў і лес, і бор.
Завеі заспявалі
на ўвесь лясны прастор.
А мішка і не дба́е.
Яго спакойны сон.
Ён спіць на мяккім вецці
аж да вясенніх дзён.




Правообладатель Национальный институт образования

1. У якія поры года адбываюцца падзеі ў вершы?
2. Як мядзведзь рыхтаваўся да зімы?
3. Чаму ў мішкі спакойны сон?
4. Пра што гаворыцца ў першай частцы верша? У другой частцы?
5. Як зразумець выразы: «завеі заспявалі...», «заснуў і лес, і бор»?
6. Навучыцеся чытаць верш выразна.

Як рыхтуецца да зімы вавёрка? Разгледзьце малюнкі. Прыдумайце і раскажыце казку «Сапраўдныя сябры».



Правообладатель Национальный институт образования